*Ганна Іванова*

# ДА ПРАБЛЕМЫ ДАСЛЕДАВАННЯ НАРОДНЫХ БАЛАД

У гісторыі збірання і вывучэння балад можна вылучыць некалькі перыядаў: 1837–1904 гг., 1936–2000 гг., 2001 г. і па сённяшні дзень. Варта адзначыць, што найбольш плённым у гістарыяграфіі баладнага жанру з'яўляецца перыяд з 1936 г. па 2000 г. Звернемся непасрэдна да прац, па змесце якіх можна меркаваць аб тым, чым быў адметны вышэйназваны перыяд у гісторыі вывучэння балад.

У кнізе «Русская баллада» [24], аўтарам якой з'яўляецца У. Чарнышоў, змешчана прадмова рускага даследчыка М. Андрэева, які даў азначэнне жанру балады і ахарактарызаваў змест гэтага зборніка. Даследчык засяродзіў значную ўвагу на баладах з міфалагічнымі матывамі, але яго найперш зацікавілі варыянты балады з сюжэтам «браткі», дзе дзеючымі асобамі з'яўляліся брат і сястра. Паводле назіранняў М. Андрэева, у баладах захаваліся ў большай ступені сляды феадальнага і прыгоннага права, чым першабытнага. Даследчыка зацікавілі таксама тэксты балад гістарычнай тэматыкі, дзе асноўнымі героямі з'яўляліся: дзяўчына, якая знаходзіцца ў палоне, татарын, радзей цешча, якая трапіла ў палон.

Заўважым, што пачынаючы з 60-х гг. XX ст. даследчыкі спрабуюць устанавіць спецыфічныя рысы жанравай формы балад, а таксама вызначыць вытокі і лёс гэтага жанру. У гэты перыяд з 1963 г. і па 2000 г. аналізуюцца зборнікі, праводзіцца актыўная праца па збіранні баладных песень.

У кнізе «Рускі фальклор» [12] змешчаны артыкул, у якім даследчык К. Гаралек звяртаецца да вывучэння праблемы ўзаемасувязей славянскіх народных балад. Пры аналізе сюжэтаў баладных тэкстаў украінцаў, беларусаў, чэхаў, рускіх і венгерцаў аўтар не выкарыстоўвае тэрмін «вобраз», але звяртае ўвагу на агульнасць і падабенства баладных сюжэтаў, што найбольш заўважна пры іх аналізе, а таксама параўноўвае галоўных герояў гэтых сюжэтаў.

Артыкул Б. Пуцілава «Руская гістарычная балада ў яе славянскіх зносінах» [23] прысвечаны даследаванню некалькіх баладных сюжэтаў, напрыклад, «браты-разбойнікі» і «сястра ў брата ў палоне», аналізуючы якія даследчык выявіў, што для балад гістарычнай тэматыкі характэрны два цэнтральныя жаночыя вобразы (дзяўчына-паланянка і нявеста-паланянка) і адзін мужчынскі – брат. Пры гэтым даследчык падкрэсліў прысутнасць у тэкстах балад зборнага вобраза татар, якія «гоняць палон» і жадаюць абраць шлюб з паланянкамі.

У артыкуле «Баллады о гибели оклеветанной жены» [6] даследчык Д. Балашоў, прааналізаваўшы тэксты рускіх і беларускіх балад, вылучыў у розных іх варыянтах два вобразы – мужа і жонкі. Найбольшую цікавасць выклікае вобраз «клеветника». Д. Балашоў заўважыў, што ў межах развіцця баладнага сюжэта назіраецца змена сацыяльнага статусу герояў балад (ад прывілегіяванага саслоўя да простага салдата).

Даследчык І. Зямцоўскі, прааналізаваўшы тэкст міфалагічнай балады аб дачцэ-птушцы ў артыкуле «Балада аб дачцэ-пташкі» [13], звярнуў увагу на характар міграцыі сюжэта і адпаведна на своеасаблівасці нацыянальнага варыянта балады. Аўтарам адзначаны і той факт, што паэтычныя вобразы складваліся ў адпаведнасці з іх гісторыяй, бытам і псіхалогіяй. У артыкуле пэўная ўвага звернута на кампазіцыю і сюжэтнае афармленне балады.

Ва ўступным слове Д. Балашова, якое змешчана ў кнізе «Народныя балады» [7], прапанавана азначэнне тэрміна «балада». Карыснымі з'яўляюцца назіранні аўтара, звязаныя з мастацкай спецыфікай баладных тэкстаў, іх кампазіцыяй. Д. Балашовым на багатым фактычным матэрыяле прааналізаваны сюжэты баладных тэкстаў і слушча адзначана, што ў цэнтры ўвагі балады знаходзіцца «індывідуальны чалавечы лёс» [7, *7*].

Дасканалыя ўзоры народных балад у складзеным Н. Гілевічам зборніку «Песні сямі вёсак» [10], у якім змешчаны студэнцкія запісы, зробленыя ў экспедыцыях, праведзеных у цэнтральных раёнах Беларусі. Выяўленныя аўтарам жанравыя разнавіднасці балады дазволілі яму вылучыць іх у асобныя раздзелы. Адзначым, што адбор балад быў праведзены скрупулёзна, з улікам мастацкай спецыфікі гэтага жанру. Найбольшай ўвагі заслугоўвае навукова-папулярны нарыс Н. Гілевіча «Наша родная песня» [11], дзе аўтар (у пятым раздзеле «Песні эпічнага і ліра-эпічнага складу»), падаючы шэраг трапных назіранняў пра месца і значэнне балады ў народным рэпертуары, гаворыць пра яе жанравую прыроду, тэматыку, матывы, мастацкія асаблівасці. Даследчык таксама звяртае ўвагу на герояў баладных тэкстаў, раскрывае іх унутраны свет, аналізуе паводзіны і ўчынкі герояў пры дапамозе вобразна-выяўленчых сродкаў. Падкрэслім, што Н. Гілевіч не ставіў асобнай задачы прадставіць вобразы ў пэўнай сістэме.

Рускі даследчык У. Анікін (кніга «Русское народное поэтическое творчество» [2]) звярнуўся да гісторыі вывучэння і збірання балад, а таксама азначэння гэтага паняцця. У падраздзеле «Балады XIV–XVI стст.» даследчык прааналізаваў тэксты балад, якія былі найбольш папулярнымі для гэтага перыяду, і вызначыў наступных дзеючых асоб: муж і жонка, брат і сястра, яе палюбоўнік. Аднак у наступным падраздзеле

«Антыклерыкальныя балады» У. Анікін вылучыў іншую групу дзеючых асоб баладных тэкстаў: свякруха, муж і жонка, якую «оклеветали», а таксама з цягам часу замест свякрухі вылучаецца іншая гераіня – «старыца-манахіня». У падраздзеле «Балады XVII ст.» даследчыка зацікавіў сюжэт, дзе дзеючымі асобамі з'яўляюцца дзяўчына, якая здольна адпомсціць свайму каханаму, і малады хлопец.

У кнізе М. Краўцова «Праблемы славянскага фальклору» [15] мае месца асобны раздзел «Славянская народная балада», у якім даследчык, прааналізаваўшы розныя сюжэты славянскіх баладных тэкстаў, адзначае таксама некаторыя іх асаблівасці: матывы, кампазіцыйную арганізацыю і вобразы, якія характэрны для пэўнай тэматычнай групы балад, а таксама параўноўвае іх з лірычнымі песнямі і робіць выснову адносна адрозненняў іх вобразаў.

У вучэбным дапаможніку «Славянскі фальклор» [21] змешчаны артыкул даследчыка П. Лінтура «Баладная песня і народная казка», які прысвечаны аналізу народнай казкі і блізкіх па сваім змесце да яе сюжэтаў баладных песень. Аўтар адзначае пэўную сувязь казкі і балады, што выяўляецца ў адзінстве кампазіцыі, вобразных сродкаў і тэкстуальных супадзенняў. Аналізуючы сюжэты балад, якія блізкія сваім зместам да казак, даследчык звяртае ўвагу на дзейных асоб баладных тэкстаў, а таксама адзначае факт пашыранасці ў баладах жаночых і мужчынскіх вобразаў.

У аўтарэфераце десертацыі рускай даследчыцы А. Кулагінай «Руская народная балада як жанр» [20] змешчаны кароткія звесткі пра галоўных дзеючых асоб, якіх даследчыца прапанавала падзяліць на галоўных і другасных. Паводле яе меркаванняў, важную ролю ў паэтычнай сістэме балад займаюць эпітэты. У тэкстах балад выкарыстоўваюцца ў меншай ступені мастацкія сродкі, якія запавольваюць дзеянне – параўнанні і паралелізм, гіпербала.

Беларускі даследчык А. Ліс у манаграфіі «Купальскія песні» прысвяціў асобны раздзел «Баладныя песні Купалля» [22] даследаванню балад. Засяродзіўшы ўвагу на агульнай характарыстыцы групы сюжэтаў, якія генетычна, функцыянальна або тэматычна звязаны з летнім каляндарным цыклам народнай паэзіі, даследчык выявіў адлюстраваныя ў купальскіх баладах тыя праявы жыцця, якія склалі аснову сюжэтных калізій. А. Ліс адзначыў, што сувязь балады з календаром наклала «пэўны адбітак на іх мастацкую прыроду: на вобразы, некаторыя выяўленчыя сродкі» [22, *120*].

Фалькларыст Р. Шырма ў сваёй працы «Песня – душа народа» [27] адзначыў, што «песня пераказвала мастацкімі вобразамі долю і нядолю многіх пакаленняў» [27, *145*]. Варта прыгадаць, што ў раздзеле «Белару-

скія каляндарна-абрадавыя песні» даследчык аналізуе баладу-загадку, змешчаную сярод каляндарных песень, і звяртае ўвагу на дзеючых асоб (галоўную гераіню – дзяўчыну і хлопца), а таксама на кампазіцыйную арганізацыю твора.

Рускі фальклараст М. Краўцоў у раздзеле кнігі «Славянскі фальклор» [18], прысвечаным баладам, звярнуў увагу не толькі на тэрмін «балада», але патлумачыў папулярнасць жанру ў 70-я г. XX ст. Каштоўнасць гэтага раздзела заключаецца ў тым, што даследчык вызначыў, чым абумоўлена адрозненне дзеючых герояў (сацыяльныя і сямейныя ўзаемаадносіны), а таксама вызначыў іх тыпы ў адпаведнасці з характарам, функцыянальнасцю, роляй у сюжэце, напрыклад, «згубнік», «ахвяра», «подстрекатель», «спачуваючы».

Даследчык М. Краўцоў у раздзеле «Баладныя песні», змешчаным у кнізе «Руская вусная народная творчасць» [16], значную ўвагу надаў мастацкім асаблівасцям балад, а таксама прапанаваў падзяліць іх на наступныя тэматычныя групы: сямейныя, гістарычныя і сацыяльна-бытавыя. Даследчык звярнуў увагу на дзеючых асоб у межах кожнай групы і вылучыў найбольш тыповых герояў.

Даследчыцай А. Кулагінай у кнізе «Руская народная балада» [19] у раздзеле «Склад і групіроўка дзеючых асоб» прааналізаваны дзеючыя асобы казак, былін, лірычных песень і балад і зроблены высновы, што героі балад падобны да герояў лірычных песень. А. Кулагіна назвала найбольш папулярных герояў балад: муж і жонка, дзяўчына і хлопец, бацька, свякруха і нявестка, заўважыўшы, што ў баладах сямейнай тэматыкі круг дзеючых асоб шырэйшы. Даследчыца адна з першых адзначыла, што героі балад адрозніваюцца па «грамадскаму і сямейнаму статусу» [19, *53*], а таксама па функцыянальнасці («згубнік» і «ахвяра»). У раздзеле «Некаторыя асаблівасці паэтычнай мовы» А. Кулагіна прааналізавала мастацкія сродкі, якія трапляюцца ў тэкстах балад, і высветліла найбольш частотныя з іх (эпітэты простыя і двайныя). Радзей, як адзначыла аўтар, трапляюцца параўнанні, гіпербалы, іншасказанні і інш.

Зборнік «Балады» у двух тамах [4; 5] з уступным артыкулам і каментарыямі Л. Салавей, можна меркаваць, забяспечыў у беларускай фалькларыстыцы сур’ёзную навуковую аснову вывучэння баладнага жанру.

Упершыню ў беларускай фалькларыстыцы даследчыца Л. Салавей у сваёй працы «Беларуская народная балада» [25] паспрабавала высвятліць праблемы генезісу і развіцця беларускай балады, а таксама разгледзела ідэйна-мастацкі змест гэтых твораў. Адзначым, што даследчыца прапанавала класіфікацыю баладных тэкстаў па пэўных групах (балады міфалагічныя, балады казачныя і легендарныя, балады, якія змяшчаюць загадкі, балады гульнёва-карагоднага складу, балады навелістычныя). Асобную

ўвагу Л. Салавей засяродзіла на мастацка-выяўленчай сістэме твораў гэтага жанру. У раздзеле «Балады міфалагічныя» даследчыца адзначыла, што вобразы ў баладах часцей за ўсё – гэта «фальклорныя шаблоны». Пры аналізе балад казачных і легендарных Л. Салавей праводзіць паралелі паміж сюжэтамі казак і казачных балад і адзначае, што ад казкі «тут толькі вобразы звяроў і птушак, якія дзейнічаюць, як людзі» [25, *130*].

У кнізе М. Краўцова і С. Лазуціна «Руская вусная народная творчасць» [17] змешчана глава, якая прысвечана вывучэнню балад. Заслугоўвае ўвагі зроблены даследчыкамі экскурс у гісторыю даследавання балад, а таксама іх падзел на тэматычныя групы. Заўважым, што даследчык М. Краўцоў звярнуў увагу на дзеючых асоб і асноўныя вобразы гэтых груп. У тэматычнай групе сямейных балад былі вылучаны сюжэтныя тыпы балад, дзе адзначаны ў адпаведнасці з імі дзеючыя асобы. Асноўнымі героямі для першага тыпу з’яўляюцца жонка і «муж-дэспат», а для другога тыпу характэрны іншы склад дзеючых асоб, дзе на першае месца выходзіць свякруха, якая забівае не толькі нявестку, але і роднага ўнука. У трэцім тыпе сямейных балад галоўнымі дзеючымі асобамі з’яўляюцца маці, сын і яго каханая дзяўчына. У баладах любоўнай тэматыкі даследчыкі вылучаюць тры асноўныя вобразы: вобраз дзяўчыны, якая адстойвае сваё права на выбар мужа; вобраз дзяўчыны, якая абараняе асабістую годнасць; вобраз сястры, якая здольна атруціць уласнага брата. У гістарычных баладах важнае месца займае вобраз паланянкі, якая «паўстае свабодалюбівай і непрымірымай натурай» [17, *194*]. Даследчык адзначыў, што героямі сацыяльна-бытавых балад з’яўляюцца людзі living рознага сацыяльнага статусу: «каралеўна і просты малойчык, княгіня і ключнік» [17, *196*].

У прадмове Д. Балашова, якая змешчана ў кнізе «Рускія народныя балады» [8], звяртаецца ўвага на тое, што новы час нараджае новыя песні, а разам з імі і мяняюцца героі, «важнымі становяцца лёсы простых безымянных герояў: дзяўчын і жанчын, моладцаў» [8, *6*].

У. Анікін і Ю. Круглоў у раздзеле «Баладныя песні», якія змешчаны ў кнізе «Руская народная паэтычная творчасць» [3], падаюць не толькі азначэнне жанру, а таксама выказваюць свой погляд на ўзнікненне балад. У падраздзеле «Паэтычны змест» даследчыкамі разглядаюцца прыкметы балады як песеннага жанру. У падраздзеле «Кампазіцыя і стыль» даследчыкі падрабязна разгледзелі кампазіцыю балады і адзначылі, што жанравая своеасаблівасць балады выяўляецца не толькі ў кампазіцыі, але і ў мастацкіх сродках: паўторах, эпітэтах, параўнаннях, гіпербалах, увасабленнях.

У кнізе «Беларуская вусна-паэтычная творчасць» [9] змешчаны раздзел «Балады», у якім К. Кабашнікаў таксама разглядае дыскусійнае пы-

танне, якое датычыла праблемы класіфікацыі баладных песень. Даследчык прааналізаваў найбольш папулярныя сюжэты міфалагічных балад: «Дачка-птушка», «Свякруха заклінае нявестку ў рабіну» і інш. І звярнуў увагу на дзеючых асоб, на гаротнае становішча жанчыны ў сям'і мужа, але ў межах аналізу гэтых тэкстаў не засяроджвае ўвагу на вобразах.

У манаграфіі І. Штэйнера «Беларуская балада: Вытокі жанру і паэтычная структура» [26] на багатым фактычным матэрыяле была прадстаўлена гіпотэза адносна паходжання жанру, а таксама была прапанавана класіфікацыя балад, і зроблена спроба выявіць іх нацыянальную спецыфіку, падкрэсліць самабытнасць і самастойнасць твораў.

У прадмове да зборніка «Рускія гістарычныя песні і балады» [1] С. Азбелеў прааналізаваў некаторыя сюжэты і тэматычныя групы балад. Звярнуўшы ўвагу на герояў баладных тэкстаў, аўтар акцэнтаваў найбольшую ўвагу на жаночых вобразах: свякрухі і нявесткі. Даследчык вылучыў некаторыя мастацкія асаблівасці балад: эпітэты, паўторы.

Раздзел у кнізе «Рускі фальклор» [14] Т. Зуевай таксама прысвечаны даследаванню баладных тэкстаў. У падраздзеле «Класічныя балады» даследчыца асэнсавала характар узаемаадносін паміж бацькам і яго дзецьмі, мужам і жонкай, братам і сястрой, нявесткай і свякрухай, мачыхай і падчырыцай. У баладах любоўнага зместу аўтарам сканцэнтравана ўвага на ўзаемаадносінах такіх герояў, як дзяўчына і хлопец, брат і сястра. Аналізуючы тэксты балад сямейнай тэматыкі, даследчыца вызначыла два тыпы сюжэтаў, у першым з якіх ёю разгледжаны ўзаемаадносіны паміж галоўнымі дзеючымі асобамі (дэспатычны муж і яго «оклеветанная» жонка), а ў другім сюжэтны тыпе выяўлены складаныя ўзаемаадносіны паміж свякрухай і нявесткай.

Такім чынам, на працягу вышэйназванага гістарыяграфічнага перыяду даследчыкамі праводзілася актыўная праца па вывучэнні спецыфікі жанру балад, іх класіфікацыі, асэнсаванні ідэйна-мастацкага зместу і паэтыкі.

## ЛІТАРАТУРА

1. *Азбелев, С. Н.* Русские исторические песни и баллады / С. Н. Азбелев. – М., 1991.

2. *Аникин, В. П.* Русское народное поэтическое творчество / В. П. Аникин. – М.: Просвещение, 1971. – 382 с.

3. *Аникин, В. П.* Русское народное поэтическое творчество: пособие для студентов / В. П. Аникин, Ю. Г. Круглов. – Л.: Просвещение, 1987. – 479 с.

4. Балады ў дзвюх кнігах: кн. 1. / рэд. К. П. Кабашнікаў, В. І. Ялатаў. – Мінск: Навука і тэхніка, 1977. – 782 с.

5. Балады ў дзвюх кнігах: кн. 2. / рэд. К. П. Кабашнікаў, В. І. Ялатаў. – Мінск: Навука і тэхніка, 1978. – 744 с.

6. *Балашов, Д. М.* Баллады о гибели оклеветанной жены / Д. М. Балашов // Русский фольклор. Вып. 8 / ред. кол.: А. М. Астахова, В. Г. Базанов, Б. Н. Путилов. – Мінск, 1963. – С. 138–145.

7. *Балашов, Д. М.* Народные баллады / Д. М. Балашов. – М. – Л.: Советский писатель, 1963. – 447 с.

8. *Балашов, Д. М.* Русские народные баллады / Д. М. Балашов. – М.: Современник, 1983.

9. Беларуская вусна-паэтычная творчасць: падручнік для студ. філалаг. спец. ВНУ / К. П. Кабашнікаў, А. С. Фядосік, А. С. Ліс [і інш.]. – 2-е выд., перапрац. – Мінск: Выш. шк., 1988. – 415 с.

10. *Гілевіч, Н. С.* Песні сямі вёсак: традыцыйная народная лірыка Міншчыны / Н. С. Гілевіч. – Мінск, 1973.

11. *Гілевіч, Н. С.* Наша родная песня / Н. С. Гілевіч. – Мінск: Народная асвета, 1968. – 216 с.

12. *Горалек, К.* взаимосвязь в области славянской народной баллады / К. Горалек // Русский фольклор. Вып. 8 / редкол.: А. М. Астахова, В. Г. Базанов, Б. Н. Путилов. – Мінск, 1963. – 435 с.

13. *Земцовский, И. И.* Баллада о «дочке-пташке» / И. И. Земцовский // Русский фольклор. Вып. 8 / Ред. кол.: А. М. Астахова, В. Г. Базанов, Б. Н. Путилов. – Мінск, 1963. – С. 151–158.

14. *Зуева, Т. В.* Русский фольклор / Т. В. Зуева. – М.: Флинта: Наука, 1998. – 398 с.

15. *Кравцов, Н. И.* Проблемы славянского фольклора / Н. И. Кравцов. – М.: Издательство «Наука», 1972. – 360 с.

16. *Кравцов, Н. И.* Русское устное народное творчество. Учебник для фил. фак. / Н. И. Кравцов, С. Г. Лазутин. – М.: «Высш. шк.», 1977. – 375 с.

17. *Кравцов, Н. И.* Русское устное народное творчество / Н. И. Кравцов, С. Г. Лазутин. – М.: Высшая школа, 1983. – 448 с.

18. *Кравцов, Н. И.* Славянский фольклор / Н. И. Кравцов. – М.: Изд-во Моск. ун-та, 1976. – 263 с.

19. *Кулагина, А. В.* Русская народная баллада / А. В. Кулагина. – М.: Изд-во Моск. ун-та, 1977. – 104 с.

20. *Кулагина, А. В.* Русская народная баллада как жанр / А. В. Кулагина. – М.: Изд-во Моск. ун-та, 1973. – 25 с.

21. *Линтур, П. В.* Балладная песня и народная сказка / П. В. Линтур // Славянский фольклор / отв. редакт.: Б. Н. Путилов, В. К. Соколова. – М., 1972. – С. 164–181.

22. *Ліс, А. С.* Купальскія песні / А. С. Ліс; рэд. У. А. Калеснік. – Мінск: Навука і тэхніка, 1974. – 206 с.

23. *Путилов, Б. Н.* Русская историческая баллада в её славянских отношениях / Б. Н. Путилов // Русский фольклор. Вып. 8 / редкол.: А. М. Астахова, В. Г. Базанов, Б. Н. Путилов. – Мінск, 1963. – С. 102–132.

24. Русская баллада / под ред. В. И. Чернышева; вст. ст. Н. П. Андрева. – М.: Сов. Писатель, 1936.

25. *Салавей, Л. М.* Беларуская народная балада / Л. М. Салавей. – Мінск: Навука і тэхніка, 1987. – 284 с.

26. *Штэйнер, І. Ф.* Беларуская балада: Вытокі жанру і паэтычная структура / І. Ф. Штэйнер. – Мінск, 1989.

27. *Шырма, Р.* «Песня – душа народа» / Р. Шырма. – Мінск, 1976.